# САСЛОЎНА-ПРАВАВОЕ СТАНОВІШЧА ПРАВАСЛАЎНАГА ДУХАВЕНСТВА БЕЛАРУСІ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX СТ.

Карповіч Н.В. г. Мінск, БДУ

Вывучэнне гісторыі сацыяльных і саслоўных груп насельніцтва адносіцца да ліку актуальных навуковых праблем ў айчыннай гістарыяграфіі. Асаблівае месца ў сацыяльнай структуры грамадства займала праваслаўнае духавенства, для якога было характэрна супадзенне сферы занятасці і саслоўнай прыналежнасці. Пад уплывам буржуазных рэформаў 60-70-х гг. XIXст. ва ўмовах адмены саслоўных абмежаванняў адбываецца эвалюцыя прававога статусу духоўнага саслоўя.

Упершыню асобныя аспекты характарыстыкі духоўнага саслоўя былі закрануты ў працах XIX - пачатку XXстст. У сваіх даследваннях П. Знаменскі[1], С. Рункевіч[10], Н. Руноўскі[11], абапіраючыся на значны фактаграфічны матэрыял, акрэслівалі саслоўныя правы праваслаўнага прыхадскога духавенства Расійскай імперыі, засяроджвалі сваю ўвагу на тых спецыфічных рысах, якія былі ўласцівы для духавенства Беларусі. Паколькі буржуазныя рэформы 60-70-х гг. XIX ст. не закранулі чорнае духавенства, аўтары адзначалі змены прававога становішча, уласцівыя прыхадскому духавенству.

У савецкай гістарыяграфіі праваслаўнае духавенства не з’яўлялася прадметам спецыяльнага даследвання. У апошняе дзесяцігоддзе ў расійскай гістарыяграфіі значна ўзрасла колькасць даследванняў, прысвечаных праваслаўнаму духавенству. У працах П.В. Зыранава[2], В.А. Фёдарава[14] праваслаўнае духавенства разглядаецца ў кантэксце гісторыі праваслаўнай царквы. Пытанні эвалюцыі прававога статусу праваслаўнага духавенства ў перыяд рэформ Аляксандра II, асабістыя правы духоўнага саслоўя былі акрэслены ў даследваннях Б.Н.Міронава[5], С.В. Рымскага[9], В.П. Жаўтовай і Н.А. Івановай[3].

У беларускай гістарыяграфіі з'яляюцца працы, у якіх закранаюцца асобныя моманты, харатарызуючыя духавенства. Сярод даследчыкаў значную ўвагу праваслаўнаму духавенству ўдзяляе В.В. Яноўская пры разглядзе хрысціянскіх канфесій Беларусі[15]. Але пытанні звязаныя з вызначэннем прававога становішча духоўнага саслоўя, яго ролі ў сацыяльнай структуры грамадства патрабуюць усебаковага і аб'ектыўнага даследвання.

Значны ўплыў на фарміраванне прававога поля духоўнага саслоўя аказалі законапалажэнні 60-70-х гг. XIX ст. Загадам Дзяржсавета ад 22 лютага 1867г. адмянялася спадчынная перадача прыхадскіх царкоўных пасад[8,№47138]. Палажэннем ад 16 красавіка 1869г. "Аб складзе прыходаў і царкоўных прычтаў", распрацаваным Асабовай Прысутнасцю, былі канкрэтазаваны межы духоўнага саслоўя[8,№46974]. Адпаведна прыналежнасць да духоўнага саслоўя звязвалася з абавязковым служэннем ў духоўным ведамстве, паколькі законам ад 26 мая 1869 г."Аб уладкаванні дзяцей праваслаўнага духавенства" з духоўнага звання былі выключаны ўсе дзеці духавенства[8,№46974].

Царкоўныя рэформы 60-70-х гг. XIXст. садзейнічалі развіццю ў асяроддзі духавенства пачаткаў саслоўнага самакіравння. Духавенства атрымала права збірацца на з'езды трох узроўняў: благачыныя, вучылішчныя( па вучылішчных акругах) і епархіяльныя. Значнае месца на з'ездах займалі пытанні па вырашнню царкоўна-грамадскіх спраў. У розных епархіях уваходзіць у практыку выбары кандыдатаў на розныя епархіяльныя пасады (членаў кансісторый, папячыцельстваў, праўленняў духоўных семінарый і вучылішч і інш.). Неабходнасць выбарнага парадку асабліва адчувалася пры прызначэнні на пасаду благачыннага. Так, напрыклад, Макарый, архіепіскап Літоўскі, прызнаваў выбарнае права неабходным для прызначэння на вышэй адзначаную пасаду і склаў правілы выбараў, якія сталі ўзорам для іншых епархій[13,с.1]. К пачатку 1880-х гг. склалася развітая сістэма выбарных органаў духавенства, якая актыўна вырашала пытанні пастырскай дзейнасці,

упарадкаванне прыходаў, царкоўна-прыхадскіх школ г.д. і садзейнічала пашырэнню іх правоў[4,с.194-195].

Прадстаўнікі духоўнага саслоўя захавалі шэраг раней набытых асабістых правоў. Яны вызваляліся ад цялеснага пакарання, ад падушнай подаці, а пасля яе адмены мела шэраг ільгот па выкананню дзяржаўных, земскіх і гарадскіх збораў і подацей. Асобам духоўнага стану (акрамя манаства) дазвалялася набываць і прадаваць землі і дама ў гарадах і сёлах[12,ст.394-397].

Правы духавенства, асабліва маёмасныя: карыстанне зямлёй, дамамі, капіталамі, падатковымі ільготамі, ажыццяўляліся праз цэрквы, манастыры і архіерэйскія дамы. Манастыры і архіерэйскія дамы валодалі загараднымі дварамі, рыбнымі лоўлямі, зямлёй і іншымі ўгоддзямі, якія адвадзіліся ім дзяржавай. Гэтыя ўгоддзі і землі яны не мелі права прадаваць альбо адчуждаць, але маглі здаваць іх у наём. Манастыры, архіерэйскія дамы, а таксама цэрквы мелі права набываць у маёмасць ненаселеныя нерухомыя маёнткі з дазволу Сінода, але не маглі валодаць альбо набываць населеныя нерухомыя маёнткі. Падвор'і архіерэйскіх дамоў і атрымліваемые з іх даходы знаходзіліся ў поўным карыстанні архіерэя, але здаваць іх дазвалялася не болей, чым на дванаццаць гадоў. Землі, лясы, угоддзі, атрыманыя ад дзяржавы на ўтрыманне манастырамі, архіерэйскімі дамамі як і цэрквы вызваляліся ад уплаты земскіх збораў. Гарадавое палажэнне 1892г. вызваляла ад збораў з нерухомай маёмасці, якая не прносіла прыбытку[12,ст.432, 433, 435, 437, 439, 443].

У адрозненні ад белага духавенства ў вызначэнні прававога становішча чорнага духавентва значнае месца займалі манаскія абеты і шэраг канаічных нормаў. Прыняўшыя пострыг адракаліся назаўсёды ад сваёй маёмасці і не мелі права набываць нерухомую маёмасць. І хаця манаства мела права будаваць і набываць келы ў манастыры, але потым яны заставаліся на карысць манастыра. Дазвалялася валодаць рухомай маёмасцю: грашыма, кнігамі. Грошы яны мелі права ўносіць у крэдытныя ўстановы, але пасля іх смерці яны пераходзілі ў манастырскую казну. Такім чынам, чорнае духавенства пазбаўлялася права

наследвання. Выключэнне было для духоўных уладаў, паколькі яны маглі складаць завяшчанне на рухомую маёмасць на карысць сваякаў альбо на богаўгодныя справы. Манаству спынялася выплата пенсій, яны не мелі права займацца гандлем, акрамя продажу прадметаў сваёй працы з дазволу свайго кіраўніцтва[12,ст.416-417, 20, 424].

Нягледзячы на яўныя адрозненні ў працэсе фарміравання духавенства, а ў сувязі з гэтым адметнасці ў яго складзе – яно мела і агульнае. На працягу большай часткі разглядаемага часу духавенства хаця і з'яўлялася адкрытым для розных слаёў насельніцтва, але перашкоды былі для асоб былых падатковых саслоўяў. Пры адсутнасці спадчыннасці ў фарміраванні чорнага духавенства, колькасць выхадцаў з сем'яў духоўнага саслоўя была значная. Нягледзячы на адмену абавязковай духоўнай адукацыі для дзяцей духавенства, а таксама прыналежнасці да духоўнага ведамства, большасць іх рушыла па шляху бацькоў. Але у заканадаўстве не засталося ніякіх падставаў для захавання саслоўнасці духавенства, таму такі факт можна растлумачыць як традыцыю, а таксама часовую з'яву. А павелічэнне колькасці прадстаўнікоў іншых сацыяльных груп ў духоўных семінарыях дае магымасць абнавіць ў далейшым склад праваслаўнага духавенства. Так, напрыклад, калі ў Мінскай семінарыі ў 1873г колькасць іншасаслоўных вучняў складала -5%[6,с.11], то ў 1898г.- 30%[7,с.8-8об].

Такім чынам, законапалажэні 60-70-х гг. ХІХст. спрыялі пашырэнню правоў праваслаўнага духавенства і садзейнічалі эвалюцыі духоўнага саслоўя ў прафесійную групу.

1. Знаменский П. В. Руковдство к русской церковной истори / П.В.Знаменский.- Мн.: Харвест:[Изд-во Бел.Экзархата-Бел. Православ. Церкви], 2005 - 575с.
2.Зырянов л. П. В. Русские монастыри и монашество в XIX и начале XX века.- М.: ООО «ТИД « Русское слово- РС», 1999.- 312с.; ил.,табл.

3. Иванова Н.А., Желтова В. П. Сословно-классовая структура России в конце XIX и начале XX века/ Н.А. Иванова, В.П. Желтова; Ин-т рос. Истории.- М.: Наука, 2004.-574с.
4.Минские епархиальные ведомости за 1872г.- Мн.: Губернская тип. -1872.
5.Миронов Б.Н. Социальная история России периода империи( XVIII- начало XXв.).- Спб., Дмитрий Буланин, 1999. Т.I 547[1]с.; ил. табл.
6.Падлічана: Минские епархиальные ведомости за 1873.-Мн.,-1873.
7.Падлічана : Ф.136.оп.1. ед.хр. 36514.
8. Полное собрание законов Российской империи повелением государя Николая Павловича составленное: Собр.II.-е.: С 12 декабря 1825г.- Спб.: тип. отд. собств.его императорского величества, 1830.- 973с.Т.44. Отд.I.
9.Римский С.В. Российская церковь в эпоху великих реформ: (Церковные реформы в России 1860-1870-х гг.). М., 1999.С. 532.
10. Рункевич С.Г. Русская церковь в XIX в. – Спб., 1901.
11. Руновский Н. Церковно-гражданские законоположения относительно православного духовенства в царствование императора Александра II. – Казань, 1898.
12. Свод законов российской империи. Законы о состояниях. Т. 9. Раздел II. О духовенстве. Гл. I. Общие постановления. – Спб., 1899.
13.Ф. 96. Оп. 8.Ед.хр.87.
14.Фёдоров В. А. Русская православная церковь и государство: Синодальный период (1700-1917)/ МГУ им. Ломоносова.- М.: Русская панорама, 2003.- 479с.; ил., табл.
15. Яноўская В.В. Хрысціянская царква ў Беларусі 1863-1914 гг. /В.В.Яноўская. – Мн.: БДУ, 2002.- 199с.; іл.